РАШЭННЕ
метадычнага савета
ДУ «Мінская абласная
бібліятэка імя А.С. Пушкіна»

2 сакавіка 2023 № 1
г. Мінск

Аб выніках абласнога тура
XXXI рэспубліканскага конкурсу
«Бібліятэка – асяродак нацыянальнай
культуры»

Краязнаўства, гісторыка-культурная спадчына з'яўляюцца спрадвечнымі крыніцамі фарміравання нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва. З мэтай узмацнення ролі публічных бібліятэк у зборы, захаванні і папулярызацыі інфармацыйных рэсурсаў па краязнаўстве, нацыянальнай гісторыі, літаратуры, мове, народнай культуры, а таксама для падтрымкі і развіцця чытання праводзіцца чарговы тур рэспубліканскага штогадовага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры».

На абласны тур XXXI рэспубліканскага конкурсу-агляду былі прадстаўлены 9 прац ад наступных бібліятэк: ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка», Заастравецкая сельская бібліятэка ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка», ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка імя І. А. Муравейкі», Мар'інагорская гарадская бібліятэка ДУК «Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка», ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка», Нарацкая пасялковая бібліятэка ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка», ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка», ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса», ДУК «Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка».

Матэрыялы, якія былі прадстаўлены на абласны конкурс, уключалі: заяўку, інфармацыйную і аналітычную даведкі аб рабоце бібліятэк за апошнія тры гады, ксеракопію статута ўстановы культуры, дадаткі ў выглядзе інфармацыйна-бібліяграфічных і аналітычных матэрыялаў, рэкламнай і выдавецкай прадукцыі, сцэнарных і электронных матэрыялаў, прэзентацый, відэаролікаў і г.д.

Разгледзеўшы конкурсныя матэрыялы, метадычны савет ВЫРАШЫЎ:

Прызнаць пераможцамі абласнога тура і прадставіць да ўдзелу ў XXXI рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»:

У намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»:

Сярод гарадскіх бібліятэк:

ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка імя І. А. Муравейкі» (дырэктар Ермак Валянціна Аляксандраўна) – І месца за рэалізацыю інфармацыйна-пазнавальнага праекта «Город, в котором я живу».

ІІ месца паміж сабой раздзялілі:

ДУК раённая «Мінская цэнтральная бібліятэка» (дырэктар Пунінская Аксана Ільінічна) – за рэалізацыю патрыятычнага анлайн-праекта «Листая истории страницы»;

ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» (дырэктар Муравейка Людміла Адамаўна) – за рэалізацыю патрыятычнага праекта «Сиреневый код Солигорска», накіраванага на работу з моладдзю.

Сярод сельскіх бібліятэк:

Нарацкую пасялковую бібліятэку ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка» (дырэктар Нырцова Таццяна Ананьеўна) – І месца за рэалізацыю серыі праектаў: праекта па патрыятычным выхаванні дзяцей і падлеткаў «З памяццю ў сэрцы», праекта па прапагандзе чытання сярод дашкольнікаў «Выхаваць кнігалюба», культурна-асветніцкага праекта «Госць у бібліятэцы» і іншых, накіраваных на ўсебаковае развіццё падрастаючага пакалення.

У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу»:

Сярод гарадскіх бібліятэк:

ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса» (дырэктар Драчан Аксана Валер’еўна) – І месца за плённую працу па вывучэнні, захаванні і папулярызацыі спадчыны Алеся Махнача – беларускага драматурга, публіцыста, заслужанага работніка культуры Беларускай ССР.

Сярод сельскіх бібліятэк:

Заастравецкую сельскую бібліятэку ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка» (дырэктар Казлоўскі Сяргей Казіміравіч) – І месца за стварэнне этнаграфічнага кутка інтэрактыўнага праекта патрыятычнай накіраванасці «А сэрца імкнецца да роднага краю», мэтай якога з’яўляецца вывучэнне гістарычнай спадчыны роднага краю. Вынікам даследчай працы стала стварэнне сайта на бясплатнай аснове для інтэрактыўных зносін паміж бібліятэкай і карыстальнікамі.

У намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»:

Сярод гарадскіх бібліятэк:

ДУК «Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка» (дырэктар Ліфанава Наталля Віктараўна) – I месца за арыгінальны падыход і стварэнне праекта літаратурнай кавярні «Вкусные книги»;

ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» (Маеўская Наталля Мікалаеўна) – II месца за рэалізацыю рэалізацыю краязнаўча-асветніцкага праекта «Родная гісторыя – для ўсіх і для кожнага».

У намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання»:

Мар'інагорскую гарадскую бібліятэку ДУК «Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка» (дырэктар Андросава Ала Леанідаўна) – I месца за прасоўванне чытання праз рэалізацыю праекта «Сэрцу дарагая – Беларусь мая».

2. Пераможцаў абласнога тура XXXI рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ўзнагародзіць дыпломамі на абласной школе дырэктара.

3. Па выніках абласнога этапа на разгляд рэспубліканскага аргкамітэту прадставіць працы бібліятэк у наступных намінацыях:

У намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»: ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка імя І. А. Муравейкі», Нарацкая пасялковая бібліятэка ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка».

У намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»: ДУК «Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка».

У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу»: ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса», Заастравецкая сельская бібліятэка ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка».

У намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання»: Мар'інагорская гарадская бібліятэка ДУК «Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка».

4. Кантроль за выкананнем рашэння ўскласці на намесніка дырэктара па бібліятэчнай рабоце ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна» Белавушка Н.У.

Дырэктар Н.М. Вашчыла

РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ * Дзяржаўная установа «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна» * гор. МІНСК *